# IX ДРУГОЕ НАРАДЖЭННЕ

## З успамінаў М. П. Марцён, в. Гольні

Дзень Перамогі для былых вязняў фашысцкіх канцлагераў - самае светлае свята. Гэта, без перабольшвання можна сказаць, іх другое нараджэнне. Бо надзеі на жыццё не было. «Дзень і ноч, - успамінае Марыя Паўлаўна Марцён з вёскі Гольні, - стаяў над баракамі Майданака чорны дым крэматорыяў. Мёртвых і зусім нямоглых, хто не даваў ужо рады хадзіць, скідвалі на тачку і пад канвоем нявольніцы цягнулі яе да тых страшных печаў. Спальвалі і людзей у сіле - за тое, што яны не арыйскай расы».

Васемнаццацігадовай дзяўчынкай трапіла ў 1942 годзе Марыя Паўлаўна ў Майданак. І юнацтва стала самай горкай парой яе жыцця. Жыццё ў фашысцкай фабрыцы смерці, з парадкавым нумарам на дыктавай дошчачцы, якую насіла на грудзях... Тую дошчачку пасля вайны яна захоўвала, як горкі ўспамін. А потым - выкінула. Толькі як выкінеш самі ўспаміны? Як пазбавішся ад сноў, што прыходзяць з пары ўжо 50-гадовай даўнасці?

Пасля Майданака быў жаночы канцлагер Равенсбрук, лагер у Саксоніі. Не думала дзяўчына з Бераставіччыны, што выжыве, што дачакаецца яе спакутаваная матуля. І як не быць дню вызвалення самым радасным, самым шчаслівым у яе жыцці? І ў жыцці яе сям'і - разам з мужам Дзмітрыем Канстанцінавічам яна выгадавала сына і дачку, мае чатыры дарослых унука.

Марыя Драпеза, в. Гольні,
1995 год.